# Совецкі патрыёт

ОРГАН ЛЯХАВІЦКАГА РК КП(б)Б І РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

№ 10 (93) | Панядзелак, 5 лютага 1945 г. | Цана 15 кап.

**Працоўныя Ляхаўшчыны! Самаадданай працай у совецкім тылу наблізім час разгрома гітлераўскай Германіі!**

## ПАСТАНОВА

### аб'яднанага паседжання Ляхавіцкага райсовета дэпутатаў працоўных і раённага камітэта КП(б)Б аб выкананні плана лесанарыхтовак і лесавывазак 1-га квартала 1945 года па Ляхавіцкаму раёну

У мэтах хутчэйшага выканання плана лесанарыхтовак і лесавывазак 1-га квартала 1945 года па раёну і ў разрэзе кожнага сельсовета і, тым самым, аказання эфектыўнай дапамогі наступаючай Чырвонай Арміі і аднаўлення народнай гаспадаркі, разбуранай нямецка-фашысцкімі захопнікамі, райсовет дэпутатаў працоўных і РК КП(б)Б ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. Устанавіць для сельсоветаў, якія датэрмінова выканаюць і перавыканаюць план лесанарыхтовак і лесавывазак 1-га квартала 1945 года, пераходны Чырвоны Сцяг райсовета дэпутатаў працоўных і РК КП(б)Б.

2. Зацвердзіць тры прэміі сельсоветам, якія датэрмінова выканаюць план лесанарыхтовак і лесавывазак 1-га квартала 1945 года.

Першая прэмія ў 1.000 руб.
Другая прэмія ў 600 руб.
Трэцяя прэмія ў 400 руб.

3. Пераходны Чырвоны Сцяг райсовета дэпутатаў працоўных і РК КП(б)Б выдаецца сельсовету, які першы па раёну выканае план лесанарыхтовак і лесавывазак 1-га квартала 1945 года.

4. Першым кандыдатам на атрыманне пераходнага Чырвонага Сцяга залічыць Ліпскі сельсовет (старшыня тав. Дыдышка), які выканаў план да 1 лютага 1945 года па нарыхтоўцы леса на 97 процантаў і па вывазцы на 96 процантаў.

5. Лічыць аспарваючым пераходны Чырвоны Сцяг—Федзюкоўскі сельсовет (старшыня тав. Уфімцаў), Астраўскі сельсовет (старшыня тав. Такарчык) і Сваятыцкі сельсовет (старшыня тав. Стульба).

6. Абавязаць партыйныя і совецкія арганізацыі шырока папулярызаваць сярод працоўных раёна данае рашэнне і прыняць усе неабходныя меры, каб датэрмінова выканаць план лесанарыхтовак і лесавывазак 1-га квартала 1945 года.

Старшыня выканкома Ляхавіцкага райсовета дэпутатаў працоўных ЗАСМУЖЭЦ.

Сакратар Ляхавіцкага РК КП(б)Б ДЗЕСЮКЕВІЧ.

## Узорна падрыхтуемся да веснавой сяўбы

Падсобная гаспадарка „Гажэвічы“ распачала дзейную падрыхтоўку да правядзення ўзорнай веснавой сяўбы.

Мы склалі план правядзення сяўбы. Цяпер вывозім на поле гной, у хуткім часе адсартыруем насенне, рыхтуем парнікі. Ранняй вясной мы будзем мець свежыя гуркі і памідоры.

Загадчык падсобнай гаспадаркі Грышын.

## Ад Совецкага Інформбюро

(З АПЕРАТЫЎНАЙ ЗВОДКІ ЗА 3 ЛЮТАГА).

На працягу 3-га лютага ў Усходняй Прусіі нашы войскі працягвалі весці наступальныя баі ў ходзе якіх занялі больш 30 населеных пунктаў.

Паўночна-заходней і заходней гор. Шнайдэмюль нашы войскі занялі гарады: Флотаў, Кроянке, Шлоппэ, Шонлак, а таксама з баямі занялі больш 40 населеных пунктаў.

Паўночна-усходней і ўсходней Франкфурта на Одары нашы войскі працягваючы наступленне авалодалі гарадамі Дросэн, Зоннебург, Рэпен, Штэрнберг, Цыленцыг, а таксама з баямі занялі больш 150 населеных пунктаў,

Паўночна-усходней горада Шнэрын нашы войскі ў выніку знішчэння акружанай групіроўкі праціўніка захапілі: гармат 163, мінамётаў 65, кулямётаў 167, аўтамашын 1627.

Узята ў палон 9.450 нямецкіх салдат і афіцэраў.
На полі боя праціўнік пакінуў больш 8.000 трупаў.

У Будапешце нашы войскі працягвалі баі па знішчэнню акружанай групіроўкі праціўніка, у ходзе якіх занялі 10 кварталаў.

Усходней і паўднёва-усходней гор. Секешфехервар нашы войскі ў выніку наступлення прасунуліся ўперад больш чым на 20 км, заняўшы пры гэтым 60 населеных пунктаў.

На працягу 2 лютага нашы войскі, на ўсіх франтах падбілі і знішчылі 176 нямецкіх танкаў. У паветраных баях і агнём зянітнай артылерыі збіт 21 самалёт праціўніка.

## Дзень мастацкага выступлення

4-га лютага 1945 года ў Ляхавіцкім гарадскім клубе паказвалася выступленне мастацкай самадзейнасці Падлескай і Жарабковіцкай НСШ, Ляхавіцкай рускай СШ і народнага хора вёскі Вялікае Падлессе.

Варта адзначыць, што сярод насельніцтва нашага раёна зацікаўленасць да мастацкай самадзейнасці павялічылася ў некалькі разоў. Яшчэ за гадзіну да пачатку выступлення на сцэне, вялікі зал клуба быў перапоўнены людзьмі.

Тры гады жыхары нашага раёна не бачылі савецкіх пастановак і не маглі чуць ні песень ні частушак. Страшныя гады прайшлі, і ў народзе зноў ажыла песня, вясёлая і мілагучная, разнеслася яна і ў нас па ўсёй Ляхаўшчыне.

Выступленне Падлескай і Жарабковіцкай школы гаворыць, паказам мастацкай самадзейнасці, што ў нас хутка наладзілася праца школ, аднавілася радасная вучоба дзяцей. Пры старанней падрыхтоўцы, яны маглі дабіцца яшчэ большага. Вечарам выступалі Ляхавіцкая сярэдняя школа і Падлескі народны хор.

Ляхавіцкая руская СШ падрыхтавалася значна лепш за папярэднія школы. Тут вучаніцы 1 і 2 класаў чотка і ясна, з інтанацыяй, дэкламіравалі вершы. Вучаніца 1 класа Дземендзьева выклікала добрае ўражанне ў глядача, выступаючы на сцэне, з сваёй дэкламацыяй і песнямі.

Добра былі выкананы школьным хорам некаторыя песні. Кіраўніку хора ўсё ж можна было дабіцца тут большага.

Асабліва добра падрыхтована было выступленне фізкультурнікаў школы і выступленне балетнага гуртка. Наогул, аб выступленні Ляхавіцкай сярэдняй школы ў глядача склалася добрае ўражанне.

У заканчэнне мастацкай самадзейнасці выступіў Падлескі народны хор з песнямі і танцамі. Хто бачыў выступленне хора ў першыя месяцы вызвалення раёна, той мог бы сказаць, што за гэты кароткі час хор вырас не толькі колькасна, але і якасна. Прысутвічаўшыя на дастойнаму ацанілі выступленне народнага хора. Пасля многіх нумароў, глядачы прасілі іх паўтарыць. І калі праграма выступлення хора была поўнасцю выканана, прысутвічаўшыя яшчэ доўга апладыравалі, просячы паказаць хора што-небудзь новае. І хор паказваў новае.

Дзень мастацкай самадзейнасці паказаў і расказаў аб многім глядачу, падкрэсліўшы, галоўнае, што толькі ў нашай савецкай краіне магчымы ўсебаковы росквіт культуры народа і яго талантаў.

Я. Гурын.

## Школа для дарослых

Распачала работу Гарбачоўская школа дарослых, Дараўскага сельсовета. Моладзь старанна ўзялася за павышэнне сваёй адукацыі. Толькі ў першы дзень адкрыцця школы на заняткі прышло 30 чалавек. Вучобу ў школе вядзе настаўнік Бубен.

М. Мільчанка.

## Падарак школы дзецям-сіратам

Вучнямі Пранчакоўскай школы па ініцыятыве школьнікаў старэйшых класаў і настаўнікаў быў праведзены збор падарункаў для дзяцей-сірат.

Усяго сабрала школа 23 пасылкі. Вучні школы іх паслалі дзецям Грушаўскага дзецдома. Выхавальнікі дзецкага дома паслалі падзяку вучням і настаўнікам школы за прысланыя падарункі.

П. Вярбіцкі.

## Адноўлена электрастанцыя

Больш месяца прайшло з таго часу, як аднавіла электрастанцыя сваю работу ў Вострава (Астраўскога сельсовета), якая была выведзена са строю немцамі пры адступленні.

Зараз, у выніку аднаўлення, загарэлася святло па ўсёй акалючай мясцовасці.

## Развіццё садоўніцтва ў Беларусі

У гэтым годзе ў калгасах Беларусі будуць адноўлены сады на плошчы ў 1.500 гектараў, у 1946 годзе — 5.000 гектараў.

## Да Польска-Чэхаславацкіх адносін

ЛЮБЛІН, 31 студзеня (ТАСС). Па паведамленню агенцтва „Полпрэс", пасол Польскай рэспублікі у Маскве Мадзелеўскі атрымаў ад Пасла Чэхаславакіі ў Маскве Фірлінгера пісьмо, у якім паведамляецца, што Чэхаславацкі Урад прызнае Часовы Урад Польскай рэспублікі і жадае ўступіць з ім у дыпламатычныя адносіны.

В. а. адказнага рэдактара В. БУРЛО.

А Б ' Я В А

Баранавіцкае абласное ўпраўленне кінофікацыі праводзіць набор на КУРСЫ КІНОМЕХАНІКАЎ якія адкрываюцца ў горадзе МІНСКУ

На курсы прымаюцца асобы абоягa пола ва ўзросце ад 16 да 35 год.

Жадаючыя паступіць павінны падаць заяву ў ЛЯХАВІЦКІ РАЁННЫ АДДЗЕЛ КІНОФІКАЦЫІ Комсамольская вуліца (будынак клуба).

ТС 20236 Адрас рэдакцыі: гор. Ляхавічы, вул. Пажарная, 8